**ДУК “Пінская гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”**

**Аддзел абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай бібліятэкі**

**Інфармацыйна-бібліяграфічны сектар**

# *ЖАЛТОЎСКІ*
# *ІВАН УЛАДЗІСЛАВАВІЧ*



## *(ДА 150-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ)*

## ШОРТ-ЛІСТ

Пінск, 2017

Іван Уладзіслававіч Жалтоўскі нарадзіўся ў Пінску ў небагатай шляхецкай сям'і. Атрымаў класічную адукацыю: добра валодаў польскай, нямецкай, італьянскай мовамі, ведаў латынь. Пасля заканчэння пінскага рэальнага вучылішча з залатым медалём у 1887 г. ён стаў студэнтам архітэктурнага аддзялення Імператарскай Санкт-Пецярбургскай акадэміі мастацтваў, вучыўся ў акадэмікаў А. Тамішка і Р. Марфельда. У 1897 г. выканаў дыпломны праект-эскіз "Народны дом", за які атрымаў сярэбраны медаль і званне архітэктара-мастака.

Пасля заканчэння навучання І. У. Жалтоўскі працаваў кіраўніком класа архітэктурнага малявання Строганаўскага мастацка-прамысловага вучылішча ў Маскве. Першыя буйныя работы архітэктара – праектаванне будынкаў Скакавога таварыства і гасцініцы "Метраполь" (Масква), рэканструкцыя палаца графа Юсупава (Санкт-Пецярбург), праектаванне ўнутранай аздобы царскага паляўнічага палаца ў в. Белавежа (цяпер Польшча) і іншыя – прынеслі яму вялікі поспех і былі адзначаны прэміямі і залатымі медалямі. Высокай ацэнкай заслуг І. У. Жалтоўскага з'явілася прысуджэнне яму ганаровага звання акадэміка архітэктуры (1909).

У 1918 – 1923 гг. узначальваў спецыяльную майстэрню, дзе распрацоўваўся план рэканструкцыі Масквы, удзельнічаў у стварэнні першага праекта перапланіроўкі горада. З'яўляўся аўтарам шэрагу будынкаў Усерасійскай сельскагаспадарчай і саматужна-прамысловай выстаўкі (1923), будынка Дзяржбанка СССР (1927 – 1929), жылых дамоў на Махавой вуліцы (1933 – 1934) у Маскве і інш. З 1923 г. архітэктар стажыраваўся ў Італіі, дзе вывучаў майстэрства дойлідаў Рэнесансу, у прыватнасці, спадчыну архітэктара А. Паладыа. Дасканала валодаючы італьянскай мовай, І. У. Жалтоўскі пераклаў на рускую мову яго трактат "Чатыры кнігі аб архітэктуры" (выдадзены ў 1938 г.).

У 1953 – 1959 гг. архітэктар узначальваў архітэктурную майстэрню-школу ў інстытуце "Маспраект". Самымі буйнымі работамі гэтага перыяду сталі праект генеральнага плана і забудовы Сочы, праектаванне Маскоўскага іпадрома, буйнапанэльных жылых дамоў, школ, кінатэатраў у Маскве, Орску, Харкаве і іншых гарадах СССР. У Беларусі пад кіраўніцтвам І. У. Жалтоўскага створаны праект галоўнай плошчы і драматычнага тэатра ў Гомелі, распрацаваны план яго пасляваеннага аднаўлення і рэканструкцыі, праекты асобных аб'ектаў у Мазыры і Пінску. Ствараючы новыя архітэктурныя шэдэўры, майстар выступаў і за захаванне старажытных пабудоў. Дзякуючы яму былі захаваны будынак Манежа на Манежнай плошчы ў Маскве, які хацелі ўзарваць. Іван Уладзіслававіч з'ўляецца

аўтарам навуковых артыкулаў па тэорыі і практыцы архітэктуры, манаграфіі “Проекты и постройки”(1955).

Дзейнасць І. У. Жалтоўскага, ганаровага акадэміка Акадэміі навук БССР (1947), акадэміка Акадэміі архітэктуры СССР (1939 – 1956) і Акадэміі будаўніцтва і архітэктуры СССР (1956), была адзначана ордэнам Леніна, трыма ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга і іншымі дзяржаўнымі ўзнагародамі. Архітэктар атрымаў званні заслужаннага дзеяча навукі і мастацтваў РСФСР (1932), заслужанага дзеяча мастацтваў БССР (1944). У 1950 г. стаў лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі СССР за праект жылых дамоў на Ленінскім праспекце ў Маскве. У Пінску імем славутага земляка названы праспект у Паўночным мікрараёне горада, а на будынку былой гімназіі, дзе вучыўся майстар, устаноўлена мемарыяльная дошка.

## Аб жыцці і дзейнасці І. У. Жалтоўскага


1. **Жолтовский Иван Владиславович** // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. Минск, 2012. Т. 3. Кн. 1 : Гомельская область. С. 270—271.
2. **Жалтоўскі Іван Уладзіслававіч** // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. Мінск, 2012. Т. 3. С. 608—609.
3. **Жолтовский Иван Владиславович** // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. Минск, 2009. Т. 1. Кн. 1 : Брестская область. С. 382.
4. **Жолтовский Иван Владиславович** // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. Минск, 2006. Т. 3. С. 563.
5. **Жалтоўскі Іван Уладзіслававіч** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. Мінск, 1998. Т. 6. С. 419.
6. **Жалтоўскі Іван Уладзіслававіч** // Архітэктура Беларусі : энцыклапедычны даведнік. Мінск,1993. С. 585—586.
7. **Жолтовский Иван Владиславович** // Национальная академия наук Беларуси : энциклопедический справочник / НАН Беларуси, Издательский дом «Беларуская навука» ; [редкол.: В. Г. Гусаков (гл. ред.)]. Минск, 2017. С. 158—159.
8. **Жолтовский Иван Владиславович** // Национальная академия Беларуси : персональный состав, 1928—2015 / [сост.: Т. С. Буденкова и др. ; редкол.: В. Г. Гусаков (пред.) и др.]. 2-е изд., испр. Минск, 2016. С. 521—522.
9. **Крэпак, Б. А.** Іван Жалтоўскі, 1867, Пінск – 1959, г. Масква : неарэнесанс, народжаны ў Пінску / Барыс Крэпак // Вяртанне імёнаў :

нарысы пра мастакоў : у 2 кн. / Барыс Крэпак. Мінск, 2013. Кн. 1. С. 195—204.

10. **Жолтовский Иван Владиславович** : вучоныя – ураджэнцы Піншчыны // Ученые Пинщины / [авт.-сост. И. А. Кибак, П. Н. Синкевич, В. В. Василевицкий]. Пинск : Пинская региональная типография, 2012. С. 50.
11. **Харэўскі, С. В.** Іван Жалтоўскі. Тэатр у Гомелі / С. В. Харэўскі // Сто твораў XX стагоддзя: нарысы па гісторыі мастацтва і архітэктуры Беларусі найноўшага часу / С. В. Харэўскі. — Вільня, 2012. — С. 184—188. **НЕТ В ФОНДЕ ЦБС**
12. **Жолтовский Иван Владиславович** // Белорусы, прославившие Россию. Россияне, прославившие Беларусь : биографический справочник / Постоян. Ком. Союз. Государства ; [авт. текста А. А. Звозников. 2-е изд., испр. и доп.]. Минск, 2011. С. 75. **НЕТ В ФОНДЕ ЦБС**
13. **Харэўскі, С.** Культавы дойлід : да 50-годдзя смерці І. Жалтоўскага / Сяргей Харэўскі // Асоба і час : беларус. біягр. альманах / С. В. Харэўскі. Мінск, 2010. Вып. 2. С. 326—332. **НЕТ В ФОНДЕ ЦБС**
14. **Жалтоўскі Іван Уладзіслававіч** // Знакамітыя ўраджэнцы Пінскай зямлі: біябібліяграфічны слоўнік / Пінская гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма ; аддзел бібліятэчнага маркетынгу. — Пінск, 2009. — С. 13—14.
15. **Нікалаеў, М.** Беларускі Пецярбург / М. Нікалаеў. — Санкт-Пецярбург : ВиТ-принт, 2009. — С. 221.
16. **Жалтоўскі Іван Уладзіміравіч** (27.11.1867 г. - 16.7.1957 г.) = Zheltovsky, Ivan Vladimirovich (b. 27.11.1867 – d. 16.7.1957) // 250 асоб з Беларусі ў дыялогах культур = 250 people from Belarus in the dialogue of cultures / [рэдактары: Т. Л. Пісарэнка, Л. У. Языковіч ; пераклад на англійскую мову Л. М. Серады]. — Мінск : Экоперспектива, 2008. — С. 293—294.
17. **Жолтовский Иван Владиславович** // Учитель вечен на земле Полесской / [авт.-сост. И. А. Кибак]. Минск, 2005. С. 188—189.
18. **Айрапетов, Ш. А.** О принципах архитектурной композиции И. В. Жолтовского / Ш. А. Айрапетов. — Москва : Едиториал УРСС, 2004. — 54, [1] с., [20] л. ил. **НЕТ В ФОНДЕ ЦБС**
19. **Шапіра, С.** Ганаровы акадэмік / С. Шапіра // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Пінска / [уклад.: В. М. Курсаў, С. Ф. Шапіра ; рэдкал.: Г. К. Кісялёў (гал. рэд.) і інш.]. Мінск : БелТА, 1998. С. 504.

20. **Архитектор Иван Владиславович Жолтовский** (1867 – 1959) : архит. мастерская-школа И. В. Жолтовского (1945 – 1959) : каталог-путеводитель по фондам музея / Гос. ком. по граждан. стр-ву и архитектуре при Госстрое СССР, Гос. науч. исслед. музей архитектуры им. А. В. Щусева : [сост.: О. М. Зюскевич, Н. И. Филюкова]. Москва : [ЦНТИ по гражданскому строительству и архитектуре], 1985. — 109, [1] с., [8] л. ил. : портр. **НЕТ В ФОНДЕ ЦБС**
21. **27 лістапада - 150 гадоў з дня нараджэння І. У. Жалтоўскага (1867 - 1959), беларускага і расійскага архітэктара** // Новыя кнігі: па старонках беларускага друку. — 2017. — № 6. — С. 15—16 (Дадатак).
22. **Штейнер, А.** Палладио в России. От барокко до модернизма / Арсений Штейнер // Искусство. — 2015. — № 2. — С. 132—133.
23. **Харэўскі, С.** В. Творчая спадчына архітэктара Івана Жалтоўскага / С. В. Харэўскі // Искусство и культура. 2013. № 2. С. 25—31.
24. **Крэпак, Б.** Неарэнесанс, народжаны ў Пінску : Іван Жалтоўскі і ягоная “любоў на ўсё жыццё” / Барыс Крэпак // Культура. 2011. 1 кастрычніка (№ 40). С. 15 ; 8 кастрычніка (№ 41). С. 15.
25. **Духан, И.** Классические формы и порядок времени / Игорь Духан // Архитектура и строительство. 2009. № 3. С. 68—74.
26. **Бырысюк, Уладзімір.** Іх дарогі пачаліся ў Пінску / У. Бырысюк // Пінскі веснік. 2009. — № 59. — С. 3.
27. **Жолтовский, Иван Владиславович** // Википедия : свободная энциклопедия [Электронный ресурс]. Режим доступа: https://ru.wikipedia.org/wiki/Жолтовский,_Иван_Владиславович
28. **Жолтовский Иван Владиславович** // Биографии знаменитостей [Электронный ресурс]. Режим доступа: http://biografiivsem.ru/zholtovskiy-ivan-vladislavovich
29. **Жолтовский Иван Владиславович** // База данных «История белорусской науки в лицах» Центральной научной библиотеки им. Я. Коласа НАН Беларуси [Электронный ресурс]. Режим доступа: http://csl.bas-net.by/anews1.asp?id=6699

Выканаўца:
*Гарачова А. Н., галоўны бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай бібліятэкі*
Кастрычнік, 2017 г.